View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

Т.Я.Старасценка

# Лексічнае выражэнне ілакутыўнай мадальнасці ў публіцыстыцы Янкі Брыля

Для выражэння ілакутыўнай мадальнасці публіцыстычных тэкстаў ужываюцца разнастайныя сродкі мастацкай выразнасці. Такія сродкі садзейнічаюць эфектыўнасці кантактаў з калектыўным рэцыпіентам і высокай прагматычнай адэкватнасці тэксту.

Мастацкай публіцыстыцы Янкі Брыля ўласціва экспрэсіўная лексіка – найперш словы з суфіксамі ацэнкі і метафарычныя намінацыі, якія адлюстроўваюць мадальныя адносіны да рэчаіснасці.

Сярод лексем з эмацыянальна-экспрэсіўнай канатацыяй –

назоўнікі: *вочачкі (вочкі), ножкі, агеньчык, пальчыкі, дожджык, домікі, студэнтачка, кепачка, мурашачка, клёшык, гаспадынька, суседачка, хустачка, мядзведзік, зорачка, жменька, куртачка, кіёчак, сняжок, кулачок, збаночак;*

прыметнікі: *маладзенькі, разумненькі, ціхенькі, цёпленькія, маленькая, танюсенькая, жоўценькія;*

прыслоўі: *раненька, павольненька, хітранька, ціхенька*.

У публіцыстычных тэкстах Янкі Брыля пераважаюць метафары, прычым метафарызуюцца розныя часціны мовы:

дзеясловы (розныя формы): ***Страляе*** *ў неба готыка касцёла* (“Сшытак першы”); *У сонцы* ***раставала****, як нябачны лёд, духмянасць новай вясны* (“Сшытак першы”); *Я ў ёй* ***схаваюся****, у людской радасці* (“Сшытак другі”); *Не* ***выбухнуў****, не* ***разарваўся*** *ад успамінаў* (“Сшытак другі”); *Пальчыкі рэдкага дажджу гарэзліва* ***абмацваюць*** *шыбу акна* (“Сшытак чацвёрты”); *Па-жабрацку нясмела* ***грукае*** *дзвярыма ўбогай хаты начны вецер* (“Родны кут”); *На маленства маё... упершыню тады* ***абрынулася*** *шчодрым снегам беларуская зіма* (“Думкі звычайныя...”); *Варшава і сёння* ***залітая*** *сонцам* (“Свет далёкі і блізкі”); *Хоць гаспадыню і называюць часамі Мэры, на стале непераможна* ***дыхалі*** *нетутэйшым цяплом багаты ўкраінскі боршч і грэцкая каша са шкваркамі* (“На тым баку планеты”); *Словам, восень тую пражыў я шчасліва, аддаючы кожнай кнізе, звыш грашовай даніны, яшчэ і восем гразкіх або* ***падмарожаных*** *кіламетраў* (“Мой Чэхаў”); ***пазалочаны*** *восенню Брэст* (“Вачыма друга”);

прыметнікі: ***смешнавата-ўзварушлівы*** *шык* (“Сшытак першы”); *Кнігі яго* (Упіта. – Т.С.) – ***іржаная, духмяная*** *проза* (“Сшытак другі”); ***бязлітасна-шчодры*** *флёксавы пах* (“Сшытак другі”); ***стрымана-радасны*** *гул самалёта* (“Сшытак чацвёрты”); ***цымбальныя*** *скокі дажджу* (“Сшытак чацвёрты”); ***святочны*** *цеплаход* (“Сшытак чацвёрты”); ***радасна-неспакойная*** *вада* (“Сшытак чацвёрты”); ***хлебна-сасновая*** *цішыня*

(“Сшытак чацвёрты”); ***румяны*** *ранак* (“Сшытак чацвёрты”); ***вялыя*** *ўсмешкі* (“Сшытак пяты”); *Столькі лішняй работы, а бацьку весела: такая гэта работа чыстая,* ***белая****, нават* ***іскрыстая*** (“Думкі звычайныя...”); *Цяпер у княжацкім замку гэтая песня пра паштальёна гучыць для мяне ў спалучэнні з цудоўным малюнкам снежнай зімы, убачанай вачыма гарадскога хлопчыка, у спалучэнні з* ***румянай, пышнагрудай*** *і* ***звонкагалосай*** *радасцю маладзіц* (“Думкі звычайныя...”); ***увішныя*** *легкавушкі* (“Вачыма друга”); ***салодкае*** *імкненне* (“Душа – не падарожніца”); ***працавітая*** *зіма* (“Душа – не падарожніца”);

назоўнікі: *Вароны – у цяжкіх чорна-шэрых* ***сярмягах*** (“Сшытак чацвёрты”); ***занавескі*** *празрыстай смугі* (“Сшытак чацвёрты”); *неабдымна агромністы* ***гарбуз*** *зямлі* (“Сшытак чацвёрты”); *Над рыштаваннямі магутныя* ***журавы*** *кранаў* (“Вачыма друга”).

У публіцыстыцы Янкі Брыля для ўзмацнення экспрэсіі спалучаюцца розныя вобразныя сродкі, найчасцей – метафары і параўнанні ў вузкім кантэксце:

*Сонца на захадзе. Зірнула з-пад хмары, як спадылба, і хвалі, неспакойныя ад халоднага ветру, неяк адразу сцюдзёна, нявесела заблішчалі пад чорнай столлю нізкага неба* (“Сшытак чацвёрты”); *Сядзіць сабе ў любой кампаніі ціхенькі, малапрыкметны таварыш і хітранька ўсміхаецца... Ты красамоўны, разумны, вясёлы – што ж, смейся, жартуй, разгортвай, як паўлін, свой хвост бліскучасці* (“Сшытак пяты”); *І другое пачуццё. І здзіўленне, і недаўменне, і пашана да таго, хто блізу сто гадоў таму назад упарта, як парастак паміж плітамі тратуара, пралез паміж дзвюма стыхіямі, рускай і польскай, насуперак усім, уключаючы і сваіх найбліжэйшых, пралез і вырас са сваім і зрэбным, і глыбока, па-народнаму, па-хлебнаму свежым беларускім словам* (“Сшытак другі”); *Чайкі, як цеплаходы, па-святочнаму белыя, чыстыя* (“ Сшытак чацвёрты”); *Якая раніца для засевак!.. Так і хочацца стаць на калені – з сявенькай, каля меха зярнят – у пухкай, цёплай раллі, што добра падышла, як падыходзіць удала рашчынены і замешаны хлеб!..* (“Сшытак чацвёрты”); *Кусты шыпшыны трапляюцца на схілах яраў ды на ўзлобках, ніколі не араных, падобных на агромністыя боханы. У калючым сярэбраным голлі яшчэ ўсё трымаюцца, таксама заінелыя, аранжавыя зморшчаныя ягады. Як светлы сон, успамінаецца тут, каля іх, матыліная ружовасць пялёсткаў, пчаліны звон і ласкавае сонца* (“Сшытак чацвёрты”); *На хаду заўважаю – з галіны старога прыдарожнага клёна, некалькі крокаў перад хлопчыкам, асядае, пакалыхваецца вялікі, як далонь асілка, пажаўцелы ліст. Калі ўпадзе перад імі – хлопчык напэўна пусціць маміну руку і пабяжыць, падніме. А можа, ліст асядзе на светлыя стружкі яго валасоў – пяшчотным дотыкам нашай, бацькоўскай рукі?..* (“Вачыма друга”); *На анямелай ад шчасця белай нерушы сям-там празубліваюцца іскаркі, нібы падміргваюць, знікаюць, зноў глядзяць* (“Душа – не падарожніца”); *Нізка пад намі відаць*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*былі хмары – халодна-шэрыя, бясконцыя, нібыта брук усясветна вялікай, проста касмічнай плошчы, пад якой, як здаецца адразу, другое бяздонне* (“Душа – не падарожніца”).

Як бачым, ілакутыўная мадальнасць лексічнага ўзроўню публіцыстычных тэкстаў Янкі Брыля выяўляецца праз лексемы з эмацыянальна-экспрэсіўнай канатацыяй і вобразныя сродкі мовы. Яны найперш узмацняюць функцыю ўздзеяння публіцыстычнага слова. І хоць такія сродкі маўлення ўласцівы, у першую чаргу, мастацкім тэкстам, дзе рэалізуюць эстэтычную функцыю, у творах Янкі Брыля яны набываюць пэўнае стылеўтваральнае значэнне. Для многіх публіцыстычных тэкстаў гэтага пісьменніка характэрна заглыбленасць у нязначныя, здавалася б, жыццёвыя дэталі, якія неабходна няспешна прааналізаваць і апісаць. У выніку ствараецца адпаведны індывідуальны стыль – з выразнымі элементамі апісання ўбачанага і перажытага.

**Літаратура**

1. Брыль, Я. Збор твораў у чатырох тамах. Т. IV. – Мінск: Беларусь, 1968. – 462 с.

2. Молчанова, М.М. Прагматика публицистического текста: автореф. дис. ... докт. филол. наук / М.М.Молчанова. – Краснодар, 2000. – С. 4 – 31.

3. Москвин, В.П. Стилистика русского языка. Теоретический курс / В.П.Москвин. – 4-е изд., перераб. и доп.—Ростов н/Д: Феникс, 2006. – С. 610 – 623.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ